**ДЗЕЙНІК** – галоўны член сказа, які называе прадмет маўлення, суадносіцца з выказнікам і з'яўляецца граматычна незалежным ад іншых членаў сказа.

Дзейнік можа абазначаць:

1) утваральніка дзеяння: *Тонкім, крыклівым голасам там, за вербамі, спявала няспелае дзяўчо* (В. Адамчык). *Побач, у халоднай цемры, трывожна шапацеў клён* (Л. Дайнека);
2) наяўны прадмет маўлення: *Восень (М. Зарэцкі); Была субота* (М. Стральцоў);
3) прадмет маўлення, што ўспрымае дзеянне або прымету: *Дол быў услany рудым лісцем, сухой рыжай папарацдю, доўгаю, пераблытанаю ... травою, збуцвелымі галінкамі* (У. Дамашэвіч). *Лазнякамі змацаваны прыбярэжныя пяскі* (І. Шамякін);
4) носьбіта прыметы або стану: *Жыццё прыгожае не толькі гармоніяй колераў, гукаў і форм* (М. Лобан). *Тут усё было іншае* (М. Капыловіч);
5) дзеянне: *Ісці тут прыемна і лёгка…* (А. Савіцкі). *Ехаць да Бялынавіч заставалася яшчэ далёка* (І. Чыгрынаў і інш.).

Паводле выражэння адрозніваюць:

**намінатыўны дзейнік** – дзейнік, выражаны назоўнікам у назоўным склоне, абагульнена-прадметным займеннікам, іншымі часцінамі мовы пры ўмове іх субстантывацыі: *Загадка ёсць у лёсе амаль кожнага мастака* (М. Стральцоў); *За навуку я дзякую бацьку* (Я. Скрыган); *Каля трохпавярховага дома, падобнага сваім вастраверхім дахам на кірху, сядзелі на лаўках двое і гралі* (В. Хомчанка); *Нашы адыходзілі з аднымі вінтоўкамі, у пацямнелых ад поту гімнасцёрках* (І. Навуменка). *Кожны ў вёсцы займаўся сваёй справай* (У. Краўчанка); *Двое ідуць наперадзе. За імі дзед Талаш, а трэці, старшы, ідзе збоку і трохі наўзбоч* (Я. Колас); *Напісанае застаецца*; намінатыўны дзейнік можа быць выражаны:

1) назоўнікам, абагульнена-прадметным займеннікам, колькасным лічэбнікам: *Дуб ціха шумеў перада мною, яшчэ не скінутым леташнім лісцем, думаў вясновую думу* (К. Кірэенка); *Я пішу гэтыя радкі на паперы, салёнай ад марскога ветру* (У. Караткевіч); *Пяць напапалам не дзеліцца; Абодва мелі што ўспомніць* (Т. Хадкевіч);
2) прыметнікам, дзеепрыметнікам, парадкавым лічэбнікам і іншымі часцінамі мовы (у тым ліку і службовымі) пры ўмове іх субстантывацыі: *Падыходзіла ўсутыч, узнімалася каменнай сцяной непадатнае, чужое…* (І. Мележ); *Успамінаецца пражытае…* (В. Дайліда); *Першыя спыніліся і пачакалі апошніх; І ўсё мілагучна для слыху майго: і звонкае "дзе" і густое "чаго"* (П. Панчанка); *Раптам да яе дайшло мернае, аднастайнае ч-чап-чап-чап* (І. Мележ);
3) сінтаксічна непадзельнымі словазлучэннямі і спалучэннямі (са значэннем колькасці, сумеснасці, вылучальнасці і інш.) розных мадэляў: *Камсамольская вуліца, як бы сама, апроч маёй волі, завяла мяне ў гарадскі парк* (Р. Сабаленка); *У гэтых мясцінах да ракі падступае запаведная Налібоцкая пушча* (В. Ціхановіч); *Двое жанок унізаліся позіркам ад калодзежа* (І. Мележ); *Прыляцелі і прызямліліся адзін за адным, амаль разам, яшчэ чатыры жоравы* (В.Вольскі); *Лётала мноства прыгожых стракоз* (Л. Дайнека); *Нарачанская група азёр – самая вялікая і вядомая на Беларусі* (В. Вольскі); *Мы з Колем шыбуем у бор чыгункай* (І. Навуменка); *І, мусіць, ніхто з іх не ўяўляў вось такім сённяшні дзень…* (Я. Сіпакоў); *Сама Вера – першакласная радыстка* (У. Савіцкі); *Усё лепшае ў жыцці параўноўваецца з вясною* (А. Кулакоўскі);
4) сказам або спалучэннем сказаў, калі яны выражаюць адно паняцце, якое характарызуецца выказнікам: *"Сэрца аддаю дзецям" выйшла ў свет у 1969 годзе* (В. Вітка); *"Жніўная песня", "Як той Зосі давялося", "Ходзяць дзеўчыны*

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

*па ваду" і многія іншыя выконваліся і выконваюцца Беларускім дзяржаўным народным хорам…* (П. Прыходзька);

**інфінітыўны дзейнік** – дзейнік, выражаны інфінітывам: *На полі працаваць – ураджай здабываць* (Прык.); *Падступіцца да берага было няпроста…* (А. Марціновіч); інфінітыўны дзейнік можа выражацца:

1) адзіночным інфінітывам: *Паляваць тут забаронена; Глядзець на іх* [*мурашак*] *было балюча* (В. Казько); *Ехаць па вуліцы давялося нядоўга…* (І.Чыгрынаў);
2) спалучэннем інфінітыва-звязкі з іменнай часцінай мовы творнага склону: *Стаць высокаадукаванымі спецыялістамі – наш абавязак; Быць старастай – клопатная справа.*

Паводле структуры вылучаюць:

**простыя дзейнікі –** складаюцца з аднаго кампанента, раўназначнага адной граматычнай форме: *Палессе – своеасаблівы край* (Б. Сачанка); *Прайсці – нельга. У іншых дома сварка, лямант, крык. А тут бясконца месяц цягнецца мядовы* (Э. Валасевіч); *Баранчык божы ў паднябессі бляе маркотна над балотам* (Я. Колас);

**складаныя дзейнікі** – утвораны са словазлучэннем і спалучэнняў розных тыпаў (без звязкі-інфінітыва): *Яны з маці толькі ўчора вярнуліся ў горад з лесу, з партызан* (Я. Сіпакоў); *Далей за станцыйным будынкам, ля самага лесу, пад дубамі, стаялі яшчэ дзве хаты* (А. Кудравец) і інш.;

**састаўныя дзейнікі** – складаюцца са звязкі-інфінітыва і назоўніка (або прыметніка, дзеепрыметніка, парадкавага лічэбніка, абагульнена-якаснага займенніка) творнага склону без прыназоўніка: *Быць брыгадзірам – справа няпростая; Стаць першым на такіх спаборніцтвах – гонар і слава.*

*М.С.Ржавуцкая*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ